

MICRO-SERIES
IDW
#6 • $3.99 • CVR A
COSTA
EPSTEIN
HENDERSON
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
CASEY JONES
BY COMICS
ПАДЛЕТКІ-МУТАНТЫ ЧАРАПАШКІ
НІНЗЯ: МІКРАСЕРЫІ КЕЙСІ ДЖОНС #6
ПЕРАКЛАД: COMICSBY


MICRO-SERIES
IDW
#6 • $3.99 • CVR B
COSTA
EPSTEIN
HENDERSON
TEENAGE MUTANT NINJA
TURTLES
CASEY
JONES
BY
COMICS
ПАДЛЕТКІ-МУТАНТЫ ЧАРАПАШКІ
НІНЗЯ: МІКРАСЕРЫІ КЕЙСІ ДЖОНС #6
ПЕРАКЛАД: COMICSBY



У СТАРЭЙШЫХ КЛАСАХ УСЁ БЫЛО ЗНАЧНА ПРАСЦЕЙ.
НЕШТА ТЫ ХЛУСІШ.
ТЫ НЕ МОГ ЗА ВОСЕМ ХВІЛІН ЗАБІЦЬ ЦЭЛЫХ ДВА ГОЛА.


ДЫ НЕ ПАДМАН-ВАЮ Я, МУЖЫК! Я ДАВЁЎ ЛІК ДА НІЧЫІ, А ПОТЫМ МЫ ПЕРА-МАГЛІ Ў ДАДАТ-КОВЫ ЧАС.
ЗІРНІ Ў ІНТЭРНЭЦЕ!
І КАЛІ Я Ў ГЭТЫМ СЕМЕСТРЫ НЕ ВЫПРАЎЛЮ СВАЕ АДЗНАКІ, МНЕ ЗАБАРОНЯЦЬ ГУЛЯЦЬ У ХАКЕЙНАЙ КАМАНДЗЕ.
АДНАК, ПАЧАКАЙ. ТАБЕ, НАПЭЎНА, ЦЯЖКА ЦІСКАЦЬ З ТРЫМА «ПАЛЬЦАМІ»?
ГЭЙ, ЁН БЫЎ МАІМ!
АГА, КАНЕШНЕ.
А ТЫ МОЖАШ ЦІСКАЦЬ З ПЯЦЦЮ ПАЛЬЦАМІ?
«ТАБЕ ТРЭБА ЧАСЦЕЙ ЗАЙМАЦЦА Ў БІБ-ЛІЯТЭЦЭ», – СКАЗАЎ ТРЭНЕР.
ЛАЙНО.
АЛЕ Я НЕ МАГУ ПРЫЗНАЦЦА ЯМУ, ШТО Я САПРАЎДЫ ЗАЙМАЮСЯ.
НЕ ХВАЛЮЙСЯ, СЛАГЕР.
У НАСТУПНЫ РАЗ ПАТРАПІШ.
АЛЕ НЕ Ў БІБЛІЯТЭЦЭ.


Я НІКОЛІ НЕ БЫЎ АМАТАРАМ БЕЙСБОЛА.
МОЖАЦЕ ПАТЭЛЕФАНАВАЦЬ КОПАМ? МОЙ СЯБАР ЗАБЫЎ СВОЙ ТЭЛЕФОН У ІНШЫМ ПАНЦЫРЫ.
МЯРКУЮЧЫ ПА ТВАІМ КІДКУ, ТЫ АМАТАР СПОРТА ПАД НАЗВАЙ «ВЯЗАННЕ».
У НАСТУПНЫ РАЗ ЗАМЕСТ ЦЯБЕ ВАЗЬМУ МІКЕЛЯНЖЭЛА...
ТЫ ЯК?
НАС ТОЛЬКІ ШТО ВЫРАТАВАЛІ ХЛОПЕЦ У ХАКЕЙНАЙ МАСЦЫ І ВЯЛІЗНАЯ ГАВАРЛІВАЯ ЧАРАПАХА.
ВОСЬ ШТО МОЖА ЗДАРЫЦЦА, КАЛІ АДЫЙДЗЕШ НА ПОЎДЗЕНЬ АД КЭНАЛ СТРЫТ.



КАЛІ МНЕ БЫЛО ДЗЕВЯЦЬ, МОЙ СТАРЫ ВЫЦЯГНУЎ МЯНЕ НА ЗАІЛЬ-ДЗЯНЕЛУЮ СТАЯНКУ Ў АДЗІН З НАЙХАЛОДНЫХ ЗІМНІХ ДЗЁН.
НАЧАПІЎ СВАЮ СТАРУЮ ХАКЕЙНУЮ МАСКУ МНЕ НА ТВАР.
ПАСТАВІЎ МЯНЕ НА БРАМУ.
СТРАЛЯЎ ПА МНЕ ШАЙБАЙ, ПАКУЛЬ У МЯНЕ НЕ З'ЯВІЛІСЯ СІНЯКІ Ў РАЁНЕ РЭБРАЎ, У МЯНЕ ЛЕДЗЬ ПАЛЬЦЫ НЕ АДМЕРЗЛІ.
СКАЗАЎ, ШТО МАРОЗ ТОЛЬКІ ЗРОБІЦЬ КРАП-ЧЭЙ МЯНЕ.
А САМ ТОЛЬКІ ПАПІВАЎ ВІСКІ, КАБ САГРЭЦЦА.
АЛЕ ПАСЛЯ ГЭТАГА ЁН ПАЧАСТАВАЎ МЯНЕ КАКАВАМ.
А ГЭТАЙ МАСКАЙ Я ДАГЭТУЛЬ КАРЫСТАЮСЯ.



АСАБЛІВА ПА НАЧАХ.
KNOCK KNOCK
ХТО ТАМ?..
АДЧЫНЯЙ, АРНІ. ГЭТА БЛЭЙК.
НЕ СУПРАЦЬ, КАЛІ МЫ ВОЙДЗЕМ?


НУ ШТО, ЯК СПРАВЫ? ЯК ТВОЙ ХЛОПЕЦ? КЕЙСІ, ТАК?
ЁН У ПАРАДКУ.
ОКЕЙ, ТЫ ВЕДАЕШ, НАВОШТА Я ПРЫЙШОЎ. Я НЕНАВІДЖУ ГЭТА, МУЖЫК. З-ЗА ЦЯБЕ Я ТРАПІЎ У ЦЯЖКУЮ СІТУАЦЫЮ.
НАКОЛЬКІ ПАМЯТАЮ, МЕНАВІТА Я ВЫЦЯГВАЎ ЦЯБЕ З ЦЯЖКІХ СІТУАЦЫЙ.
ТАК І БЫЛО...
...АЛЕ ГЭТА БЫЛО ДАЎНО. А ЗАРАЗ ТЫ АБАВЯЗАНЫ МНЕ ШМАТ ГРОШАЎ.
І НА ГЭТЫ РАЗ БІЦЬ БУДУЦЬ НЕ МЯНЕ.
ГЭЙ, ПАЧАКАЙ... ПРОСТА, ПРОСТА ПАЧАКАЙ...


АГА!
ЗДАЕЦЦА, ГЭТА ЎСЁ КАМПЕНСУЕ.
ПРАБАЧ, АЛЕ... ТАК НЕ ПОЙДЗЕ. ТЫ ЎСЁ ЯШЧЭ АБАВЯЗАНЫ МНЕ 4 ТЫСЯЧЫ.
ДАЮ ТАБЕ 48 ГАДЗІН, КАБ ТЫ АДДАЎ АСТАТНЯЕ. ПА СТАРОМУ СЯБРОЎСТВУ. НЕ ЗДРАДЗЬ МНЕ НА ГЭТЫ РАЗ.
ПЕРАДАЙ ПРЫВІТАННЕ СВАЙМУ ХЛОПЧЫКУ. ПАМЯТАЮ, ЁН ВЫКОНВАЎ ВЫДАТНЫЯ КІДКІ.


ПРЫВЕТ, МАЦІ. ВЫДАТНА ВЫГЛЯДАЕШ СЁННЯ.
ШТО СКАЖАШ, КАЛІ МЫ ЗБЕГНЕМ АДСЮЛЬ? ПАП'ЕМ КАВЫ ДЗЕ-НЕБУДЗЬ?
ЗАРАЗ, ТОЛЬКІ ВОЗЬМУ КУРТКУ...


ЯК ПРАЙШЛА ГУЛЬНЯ?
Я ЗАБІЎ ДВА ГАЛА ПАД КАНЕЦ МАТЧА. МЫ ПЕРАМАГЛІ Ў АВЕРТАЙМЕ.
МОЦНЫ ТЫ Ў МЯНЕ ХЛОПЧЫК.
АДНАК У АДРОЗНЕННІ АД САМСОНА ВАЛАСЫ Ў ЦЯБЕ КАРОТКІЯ.
А ТВОЙ БАЦЬКА БАЧЫЎ ГУЛЬНЮ?
...
ЁН НЕ ЗМОГ ПРЫЙСЦІ.



З «НАВЕДВАННЯ» БЛЭЙКА ПРАЙШЛО ЎЖО 16 ГАДЗІН.
Я САПРАЎДЫ ЗБІРАЎСЯ ЗАЙМАЦЦА ГЭТЫМ ВЕЧАРАМ. САПРАЎДЫ.
АЛЕ ГЭТА ПАЧАКАЕ.
ДЫ НУ! І ГЭТА ВЫ ЗАВЕЦЕ НАПАДЗЕН-НЕМ?
ШТО ВЫ РОБІЦЕ!? Я НА ВАС УСЕ СВАЕ ГРОШЫ ПАСТАВІЎ!
ТУПЫ ТЫ АЛКАШ.



ГЛЯДЗІЦЕ-КА! ГЭТА Ж ЛЕПШЫ ГУЛЕЦ У НАМІНАЦЫІ «САМЫ ВЕРАГОДНЫ ПРЭТЭНДЭНТ НА АТРЫМАННЕ ЛЮЛЕЙ»!
ДЗЯКУЙ, ШТО ПРЫЙШОЎ.
КАНЕШНЕ. У ЧЫМ СПРАВА? МЫ Ж НА ГЭТЫМ ТЫДНІ НЕ ПАТРУЛЮЕМ.
ГЭТА НЕ ПАТРУЛІРВАННЕ. ХУТЧЭЙ ВЫВЕДКА
ДЫ НУ? ЗА КІМ САЧЫМ? ЗА ВАЛАЦУГАМІ? НАРКАГАНДЛЯРАМІ? НАРКАМІ? ПАНКАМІ?
МНЕ ПРОСТА ТРЭБА ПРЫГЛЯДЗЕЦЬ ЗА ХЛОПЦАМІ, ЯКІМ НЕАБХОДНА, КАБ ЗА ІМІ ПРЫГЛЯДЗЕЛІ. ЗРАЗУМЕЛА?
...ДОБРА. БЕЗ ПРАБЛЕМ.


skara brae
ГЭТАЕ МЕСЦА ПРОСТА СМЯРДЗІЦЬ.
EXIT
І ГЭТА КАЖА ВАМ ЧАЛАВЕК, ЯКІ ЧАСТА БЫВАЕ Ў КАНАЛІЗАЦЫІ.
ГЭТА ВЫДАТНАЕ МЕСЦА ДЛЯ ПОШУКУ ЎСЯЛЯКІХ НЯЎДАЧНІКАЎ, ЯКІХ БЛЭЙК ЛЮБІЦЬ ПАДМАНВАЦЬ. ЯК ГЭТАГА ХЛОПЦА...
...І ТАКІХ АЛКАНАЎТАЎ, ЯК МОЙ БАЦЬКА.
МАГЧЫМА, НІЧОГА ДРЭННАГА І НЕ ЗДАРЫЦЦА.
...КАЛІ Ў МУЖЫКА АТРЫМАЕЦЦА ЗАПЛАЦІЦЬ БЛЭЙКУ Ў ТЭРМІН.


РАЗУМЕЮ, ГЭТА ЦЯЖКА. ТВОЙ БАЦЬКА НЕ ТАКІ МОЦНЫ, ЯК ТЫ.
УСЁ РОЎНА. ЁН ТУПЫ АЛКАШ...
КЕЙСІ АРНОЛЬД ДЖОНС!
ПРАБАЧ.
ПАМЯТАЙ, ЁН ТАКСАМА НЕ ХОЧА МЯНЕ ЗГУБІЦЬ, ЯК І ТЫ.
І, КАЛІ ЁН ЧАСАМ І ЛЮТУЕ, ГЭТА ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО ЁН НАПУЖАНЫ.
ПАКЛАПАЦІСЯ ПРА ЯГО, КАЛІ МЯНЕ НЕ СТАНЕ.
ТЫ АКРЫЯЕШ, МАЦІ.
КЕЙСІ, КАЛІ Я ПАМРУ, ТЫ ПАВІНЕН БУДЗЕШ КЛАПАЦІЦЦА ПРА ЯГО.



...У ПАЧАТКУ ГУЛЬНІ ЗДАВАЛАСЯ, ШТО ЯНЫ ПЕРАМАГАЮЦЬ, АЛЕ Ў АПОШНІМ ПЕРЫЯДЗЕ ЎСЁ ПАЙШЛО З ВЕТРАМ...
«...ПААБЯЦАЙ МНЕ».
КЕЙСІ... ЯКОГА ЛЫСАГА МЫ ГЛЯДЗІМ, ЯК ГЭТЫЯ ДЗЯДЗЬКІ ГЛЯДЗЯЦЬ ГУЛЬНЮ?
НАВАТ НА МЕДЫТАЦЫЮ СПЛІНТЭРА ГЛЯДЗЕЦЬ ЦІКАВЕЙ...
ШШ!
ПРАБАЧ, МЭЦЬЮ, АЛЕ ГЭТА ГУЛЬНЯ БЫЛА НЕ НА ТВАЮ КАРЫСЦЬ.
МІСТАР АНДЭРС... БЛЭЙК... Я ЎСЁ ЗРАЗУМЕЎ. КЛЯНУСЯ. НУ, ТЫ Ж ВЕДАЕШ МЯНЕ...
СЕНЗО. КАРЛА...
ПОЙДЗЕМ НА ШПАЦЫР.
ХАДЗЕМ.
ПРАБАЧ, МЭЦЬЮ. ПАВЕР, МНЕ ГЭТА ЗУСІМ НЕ ПАДАБАЕЦЦА.


НУ, МОЖА, ЗУСІМ ТРОШКІ.
МІСТАР АНДЭРС, КАЛІ ЛАСКА! Я АДДАМ ВАМ ГРОШЫ, КЛЯНУСЯ! САМ ЖА БАЧЫШ... ПРОСТА ДЛЯ «НІКС» БЫЎ ДРЭННЫ ГОД!
Я ПАСТАВІЎ ПЯЦЬ ТЫСЯЧ НА «РЭЙНДЖЭРС», І Я ЎПЭЎНЕНЫ, ШТО ЯНЫ ПЕРАМОГУЦЬ. ТРЭБА ТОЛЬКІ ПАЧА...
CHUK
ШТО ЗА ХАЛЕРА?


ЗБІРАЎСЯ Ў ГЭТЫ РАЗ УЗЯЦЬ КІЙ.
АЛЕ АД ЯГО ТАК МОЦНА ПАХНЕ КРЭЙДАЙ.


АРГ!
ЛІЧЫ, ШТО МЭЦЬЮ НІЧОГА НЕ АБАВЯЗАНЫ.
КАНЕШНЕ... ЯК СКАЖАШ... ЁН УСЁ АДДАЎ...
ЯШЧЭ РАЗ ПРЫЙДЗЕШ ДА ЯГО, І З ТАБОЙ ЗДАРЫЦЦА НЕШТА ГОРШАЕ.
ДАРЭЧЫ, АБАВЯЗАК АРНОЛЬДА ДЖОНСА ТАК САМА ЛІЧЫ АПЛАЧАНЫМ. ЦАЛКАМ.
...ДЖОНСА?..
ДЖОНС УСЁ АПЛАЦІЎ.


РАФ? У ЦЯБЕ ЎСЁ ДОБРА?
ТАК, ПАРАДАК.
РЫЗЫКОЎНЫЯ ГУЛЬНІ – ДРЭННАЯ ЗВЫЧКА.
КІДАЙ-КА ГЭТУ СПРАВУ.
ЧУВАК, ГЭТА БЫЛО ДАВОЛІ НАПРУЖАННА.
РАДЫ БЫЎ ДАПАМАГЧЫ, АЛЕ ШТО МЫ ТУТ РАБІЛІ?
ВЫКОНВАЛІ АБЯЦАННЕ.



МОЦНЫЯ ЛЮДЗІ НЕ ПАВІННЫ ЗАЎСЁДЫ НАГАДВАЦЬ АКАЛЯЮЧЫМ ПРА СВАЮ СІЛУ. ЯНЫ ПРОСТА МОЦНЫЯ І ЎСЁ.
ТАКІЯ, ЯК ТЫ, КЕЙСІ.
ТЫ ТАК САМА, МАЦІ.
...МАГЧЫМА.
ХАЦЕЎ ПРЫЙСЦІ РАНЕЙ, АЛЕ... ПРЫЙШЛОСЯ...
...ЗАТРЫМАЦЦА.
УСЁ ДОБРА, АРНІ. Я З ТАБОЙ.
Я З ТАБОЙ.


ДЗЕ ТЫ ЦЯГАЎСЯ, САБАКА ШАЛУДЗІВЫ?
НІДЗЕ.
ТЫ ЧАМУ ГРУБІЯНІШ? ДУМАЕШ, ТАКІ РАЗУМНЫ, ТАК, ЛАЙНА ТЫ КАВАЛАК?
ТАТ, ДАЙ МНЕ СПАКОЙНА ЛЕГЦІ СПАЦЬ.
ДУМАЕШ, ТЫ АДВАЖНЫ ХЛОПЕЦ?


«ПАМЯТАЙ, ТВОЙ БАЦЬКА НЕ ТАКІ СІЛЬНЫ, ЯК ТЫ».
УСЁ БУДЗЕ ДОБРА...
«АБЯЦАЙ, ШТО ТЫ ДАЗВОЛІШ ЯМУ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ МОЦНЫМ».
Я СПРАБУЮ СТРЫМАЦЬ АБЯЦАННЕ, МАМА...
АЛЕ НЕ ВЕДАЮ, ЦІ ДОЎГА ЯШЧЭ ЗМАГУ ПРАЦЯГВАЦЬ СТРЫМЛІВАЦЬ ЯГО.
THE SECOND TIME AROUND SHOPS
ГЭЙ!
КЕЙСІ!


ШТО ЗДАРЫЛАСЯ? РАФ ЖА КАЗАЎ, ШТО ВЫ НЕ ПАКУТАВАЛІ Ў БОЙЦЫ!
МАЙМУ БАЦЬКУ... НЕ СПАДАБАЛАСЯ, ЯК Я З ІМ РАЗМАЎЛЯЎ.
ГЭТА НОРМА.
OPEN
ЧУВАК... КЕЙСІ... ЯК ТЫ?
У ПАРАДКУ... Я ПЕРАЖЫВУ... БЕЗ ПРАМЛЕМ...
...Я Ж МОЦНЫ.
КАНЕЦ.